# ЦІ УМЕЕМ МЫ ЛЮБІЦЬ ДЗЯЦЕЙ?

*Віктар ЧЭЧАТ*

*Пад загалоўкам "Такая незвычайная сям'я" сумеснымі намаганнямі работнікаў Міністэрства адукацыі, Беларускага дзіцячага фонду, педагогаў, псіхолагаў, урачоў, бацькоў рыхтуецца кніга, якая адрасуецца перш за ўсе бацькам-выхавацелям дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, а таксама выхавацелям дзіцячых садоў, настаўнікам школ, работнікам органаў адукацыі, дзіцячых фондаў, студэнтам педагагічных інстытутаў. Яна ствараецца для тых міласэрных бацькоў і мацярок, якія ў наш жорсткі час (калі штогод дамы дзіцяці рэспублікі прымаюць да 800 пакінутых немаўлятак, а 80% з 10 тысяч дзяцей-сірот і дзяцей без бацькоўскай апекі з'яўляюцца сіротамі пры жывых маці-зязюлях і бацьках-уцекачах!) цеплыней чулых сэрцаў сагрэлі абяздоленых малых. Гэтых сіратак усынаўляюць, забіраюць з дамоў дзіцяці, дзіцячых дамоў, школ-інтэрнатаў у апякунскія сем'і і дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, якія пачалі стварацца ў 1988 годзе. У такіх дамах выхоўваюцца ад 5 да 10 дзяцей-сірот ва ўзросце ад некалькіх месяцаў да 15 гадоў. На сённяшні дзень у рэспубліцы 19 сем'яў (у краінах СНД — звыш 500), у якіх жывуць і выхоўваюцца 166 дзяцей, у тым ліку 122 прыемных. Перад бацькамі-выхавацелямі востра паўстаюць сацыяльна-эканамічныя, юрыдычныя, медыцынскія, псіхалагічныя і педагагічныя праблемы. Сярод іх — падбор дзяцей і адаптацыя ў новай сям'і, умацаванне фізічнага і псіхічнага здароўя, арганізацыя жыццядзейнасці, размеркаванне функцый мужа і жонкі, рэгуляцыя адносін бацькоў з роднымі і прыёмнымі дзецьмі, родзічамі, выхавацелямі, настаўнікамі, сябрамі, праяўленне бацькоўскай любві. Апошняя праблема набывае ў бацькоў-выхавацеляў асаблівую значнасць. І сапраўды, як "размеркаваць" любоў да ўсіх сваіх дзяцей, якія склалі новую незвычайную сям'ю? Кніга рыхтуецца на рускай мове, бо прызначана і для бацькоў-выхавацеляў Расіі, Украіны, Малдовы, Казахстана і інш. Аўтарамі і рэдактарамі яе з'яўляюцца старшыя навуковыя супрацоўнікі аддзялення праблем выхавання Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдаты педагагічных навук Л. І. Смагіна і В. У. Чэчат.*

*Сёння прапануем вам адзін з артыкулаў з гэтай кніжкі.*

Абсалютная большасць маці і бацькоў сардэчна і шчыра любяць сваіх дзяцей. На першы погляд, бацькоўская любоў — гэта аксіёма, тут быццам бы няма чаго і даказваць. А калі паглядзець на любоў бацькоў глыбей і канкрэтней? На пытанне "Што вы разумееце пад любоўю да дзяцей і ў чым яна канкрэтна праяўляецца?" многім маці і бацькам цяжка адказаць або яны адказваюць, што любіць — гэта значыць "шкадаваць іх", "клапаціцца пра іх", "дапамагаць ім", "песціць іх", "спачуваць ім" і г.д. І хаця гэтыя адказы шмат у чым правільныя, усё ж яны няпоўныя і недакладныя. Калі абагульніць меркаванні вопытных педагогаў, псіхолагаў і практыкаў, якія вывучаюць праблемы сям'і, то можна сказаць: бацькоўская любоў — гэта пастаянныя добразычлівыя адносіны маці і бацькі да дзяцей, пад якімі маюцца на ўвазе блізкасць, сімпатыя, павага і дапамога.

Ад характару, ступені і спосабаў праяўлення бацькоўскай любві да дзяцей залежыць многае: іх становішча у сям'і, фізічнае і маральна-псіхалагічнае здароўе, паўнацэннае іх развіццё, цяперашняе і будучае жыццё. Ці задумваліся вы, чаму дзеці часта пытаюцца: "Мамачка (татачка), ты мяне любіш?" Атрымаўшы станоўчы адказ, яны, у залежнасці ад сітуацыі, або набываюць упэўненасць, або перамагаюць пачуццё страху, або ў іх знікае трывога, неспакой, дыскамфорт. Але ва ўсіх без выключэння выпадках пры пастаноўцы падобнага пытання дзеці хочуць пераканацца ў адным: ці любяць іх бацькі па-ранейшаму і ці прымаюць іх, нават калі яны маюць недахопы, дапускаюць памылкі і пралікі.

Калі вы як бацька-выхавацель хочаце безумоўна любіць усіх дзяцей у сваёй новай незвычайнай сям'і, літаральна з першай жа хвіліны яе стварэння не забывайцеся прытрымлівацца важных псіхолага-педагагічных правілаў.

1. Прад'яўляйце да ўсіх дзяцей адзіныя бацькоўскія патрабаванні, праяўляйце натуральную мацярынскую і бацькоўскую строгасць, ласкавасць і клопат. Толькі такая пазіцыя пакажа прыёмным дзецям, што пра іх клапоцяцца не толькі таму, што абавязаны гэта рабіць, а зыходзячы з правілаў чалавекалюбства, гуманнасці, міласэрнасці. Гэта дасць магчымасць вам і іншым членам сям'і пазбегнуць вострых канфліктных сітуацый паміж роднымі і прыёмнымі дзецьмі. Нават нязначную неаб'ектыўнасць дзеянняў маці і бацькі прыёмныя дзеці адчуваюць вастрэй. Аказаўшыся, да прыкладу, сведкамі асаблівай любві, клопатаў, пяшчоты ў адносінах да ўласных дзяцей, прыёмныя тут жа паглыбяцца ў сябе, замкнуцца, зробяцца жорсткімі. У іх душах зародзіцца зайздрасць і рэўнасць, паявіцца халаднасць і абыякавасць. Яны стануць бачыць несправядлівасць і прыдзірлівасць у кожным слове і дзеяннях бацькі і маці, у кожным праяўленні любві і клопатаў пра іх, у кожнай вымове і асуджэнні іх негатыўных учынкаў. Будуць адчуваць маральна-псіхалагічны дыскамфорт у большай ступені, чым яны адчувалі яго пры самых строгіх і неаб'ектыўных адносінах выхавацеляў і педагогаў дзіцячага дома ці школы-інтэрната.

2. Праяўляйце ў адносінах да прыёмных дзяцей як мага больш любві, уважлівасці, клопатаў, цеплыні і пяшчоты. Толькі гэта дапаможа вам у кароткі тэрмін пазбавіць іх адмоўных праяўленняў псіхалагічнай дэпрывацыі (ад англ. deprivation —

пазбаўленне, абмежаванне) — сацыяльнай, эмацыянальнай, рухальнай і, самае галоўнае, мацярынскай. Абдзеленыя ласкай, яны пастаянна жадаюць адчуваць любоў і пяшчоту маці і бацькі. Педагог-журналіст Ларыса Захарава ў кнізе "Дзіця у чарзе за ласкай" прыводзіць кранаючыя за душу сітуацыі... Выхавацельніца дзіцячага дома жартоўна узлахмаціла хлопчыку валасы — ён зірнуў на яе са шчаслівай усмешкай, затым... схапіў руку жанчыны і прыціснуўся да яе вуснамі... За ім тут жа выстраілася чарга малышоў:

— І мяне пагладзьце па галоўцы! І мяне! Я за табой!..

...Дзяўчынкі з дзетдома папрасілі сваю настаўніцу схадзіць з імі у школу на бацькоўскі сход.

— Навошта? — здзівілася жанчына нечаканай просьбе.

— Мы хочам паглядзець... якія мамы бываюць... — засаромлена адказалі сямікласніцы...

...А малышы з прыёмніка-размеркавальніка, паказваючы на вокны дома, што стаіць насупраць, жаласна просяць: "Хачу дадому!"..., з крыкам "Тата!" кідаюцца да зусім чужога мужчыны.., з сумам пытаюцца ў выхавацеля, які пасля рабочага дня збіраецца дадому: "Ты дамоў ідзеш, так?" — іншы раз дадаюць: "Вазьмі мяне з сабою!"

...Малы, што сядзіць на гаршку, пяшчотна гладзіць нагу выхавацельніцы, што стаіць побач...

Клапатлівыя і пяшчотныя адносіны актыўна і ў кароткі час садзейнічаюць ліквідацыі ў прыёмных дзяцей такіх адмоўных якасцей, як жорсткасць, агрэсіўнасць, раздражняльнасць, запальчывасць, імпульсіўнасць, непрадказальнасць у паводзінах, утрыманства, варварскія адносіны да прыроды, рэчаў, адзення і інш.

3. Праводзьце час з дзіцём не таму, што абавязаны гэта рабіць, а старайцеся узбагачаць і развіваць яго ў сумесных адносінах і дзейнасці. Можна правесці з ім увесь дзень, але ён не адчуе вашай увагі і клопату. Чаму? Ды таму, што нярэдка вы проста седзіце з ім і нічога карыснага для яго развіцця не робіце. Паказальная такая карціна: маці ці бацька наглядаюць за дзіцём, усяго толькі "пасвяць" яго, даглядаюць, кормяць і перыядычна засцерагаюць ад усялякіх дрэнных учынкаў і дзеянняў большай часткай словамі. Але ж важней не тое, колькі часу вы з ім праводзіце (хаця і гэта для пэўнай часткі дзяцей і ў пэўны перыяд важна), а тое, якім чынам вы гэта робіце. Дзеці адчуваюць задавальненне і сапраўдную ўвагу і клопат, калі і бацька, і маці будуць сумесна з імі займацца хатняй працай, маляваць, ляпіць, канструяваць, шыць, вязаць, плесці, чытаць, пісаць, сачыняць, майстраваць, вырабляць самаробныя цацкі, катацца на лыжах, каньках, санках, ажыццяўляць прагулкі і экскурсіі на прыроду, гуляць у разнастайныя спартыўныя і народныя гульні, рыхтаваць і праводзіць сямейныя святы і г.д.

4. Вучыцеся выказваць сваю любоў, пяшчоту і павагу да дзяцей. Вы ў душы любіце іх, а вось практычна паказаць свае цёплыя і шчырыя пачуцці не заўседы можаце і умееце. Практыка паказвае, што пачуцці любві вы звычайна выказваеце словамі (вярбальна) або жэстамі, поглядам, мімікай, пантамімікай (невярбальна). У адносінах да малышоў дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту вы выказваеце пачуцці любві і павагі такімі словамі — "коцік мой", "ластаўка мая", "галубок мой", "ненаглядны мой", "залаты", "дарагі", "любы", "ты мой самы добры ў свеце", "ты мая самая любімая" і г.д. Падлеткам і старшакласнікам у залежнасці ад сітуацыі кажаце ўсё тыя ж прыведзеныя вышэй словы, але часцей ужываеце такія — "ты у мяне разумніца", "ты мая падтрымка", "малайчына", "ты мой рыцар", "ты мая добрая гаспадынька", "ты мой дарагі памочнік" і да т.п.

Практыка паказвае, што большасць бацькоў не ўмеюць і не ведаюць, як выказваць сваю любоў да дзяцей у іх розныя ўзроставыя перыяды. У гэтым вам дапамогуць парады айчынных і замежных педагогаў і псіхолагаў, якія вывучалі адносіны бацькоў і дзяцей. Вельмі карысныя парады амерыканскага псіхолага Джэймса Добсана і псіхатэрапеўта Роса Кэмпбэла. Прапануем вам яго парады.

1. Кантакт вачэй. Адкрыты, натуральны, добразычлівы погляд прама ў вочы дзіцяці важны не толькі для ўстанаўлення добрага камунікатыўнага узаемадзеяння з ім. Ён важны і для задавальнення эмацыянальных патрэбнасцей і настрою дзіцяці, зняцця страху і напружання. Бацька глядзіць на дзіця з любоўю заўсёды, а не толькі ў тых выпадках, калі яго павучае, папракае, крытыкуе. Яшчэ больш сур'ёзную памылку дапускаюць бацька ці маці, калі ў якасці пакарання пазбягаюць глядзець прама ў вочы дзіцяці.

2. Фізічны кантакт — бацькі галубяць немаўля, гладзяць па галоўцы, ручках, ножках, спінцы, цельцу, носяць на руках, цалуюць, датыкаюцца шчакой да шчакі, прыціскаюць да грудзей. Падлетка і старшакласніка па-сяброўску абдымаюць за плечы, гладзяць па галаве, паляпваюць па плячы, жартаўліва піхаюцца, па-мужчынску боруцца, спрабуюць сілу ў руках і г.д.

Фізічнае праяўленне любві з'яўляецца рашаючым у развіцці хлопчыка да 7-8 гадоў. Цікава, што дзяўчынкі ва ўзросце да года атрымліваюць у пяць разоў больш фізічнай ласкі, чым хлопчыкі. І эта адна з прычын таго, што з хлопчыкамі да трох гадоў значна больш ускладненняў, чым з дзяўчынкамі.

Падлеткі 11-15 гадоў усё менш жадаюць, каб іх абдымалі і цалавалі. Але патрэбнасць у ласцы і любві у іх узнікае тады, калі яны фізічна або эмацыянальна траўміраваны (стаміліся, хвараюць, перажываюць гора, адчуваюць цяжкасці ў вучобе, працы, страхі перад сном і ў сне і г.д.).

3. Пільная ўвага — бацькі поўнасцю сканцэнтроўваюцца на дзіцяці, не адцягваюць увагу ні на кога іншага і ні на што іншае. Мэта падобнай увагі — даць магчымасць адчуць, што яно для маці ці бацькі самы важны чалавек на свеце. Якім чынам забяспечыць пільную ўвагу? Вопытныя бацькі знаходзяць час, каб пабыць з дзіцём сам-насам у доме (кватэры), у паходзе, на прагулцы, экскурсіі, у час выезду да бабулі (дзядулі) у вёску і г.д.

4. Дысцыпліна, заснаваная на любві. Нават пасля пакарання дзіцяці (асабліва у 2-4 і 5-8 гадоў) бацькі не забываюць паказаць яму, што яго працягваюць любіць (ласкава паглядзець, падысці, пагладзіць па руцэ, галаве, плячах, папрасіць прабачэння, калі былі не правы ў адносінах да сына ці дачкі).